ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 267 (339) | Субота 23 лістапада 1940 г. | Цана 10 кап.

Дэлегатам першай абласной канферэнцыі МОПР — большэвіцкае прывітанне!

Выхоўваць масы ў духу пролетарскага інтэрнацыяналізма

Сёння пачынае сваю работу першая абласная канферэнцыя міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (МОПР). Гэтая важная падзея ў грамадска-палітычным жыцці нашай вобласці заслугоўвае вялікай увагі усёй нашай грамадскасці.

МОПР — адна з самых шырокіх масавых добраахвотных арганізацый працоўных у нашай краіне — адыгрывае выключна важную ролю ў справе комуністычнага выхавання працоўных, выхавання іх у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма і совецкага патрыятызма, у духу беззаветнай адданасці справе міжнароднай пролетарскай рэвалюцыі, справе партыі Леніна-Сталіна.

Роля і значэнне МОПР яшчэ больш узраслі ў сучаснай міжнароднай абстаноўцы — абстаноўцы лютуючай і ўсё расшыраючайся другой імперыялістычнай бойні, у абстаноўцы нечуванага белага тэрору імперыялістычнай буржуазіі супроць рабочага класа і яго перадавых барацьбітоў, у абстаноўцы чраватай многімі нечаканасцямі. Інтэрнацыянальная пролетарская салідарнасць, як ніколі, патрэбна зараз міжнароднаму рабочаму класу.

На тэрыторыі заходніх абласцей, дзе ў памяці працоўных яшчэ так ярка жывуць кашмары мінулага, МОПР карыстаецца вялікай любоўю і папулярнасцю найшырэйшых мас горада і вёскі, старых і дзяцей.

У маі бягучага года ў абласное оргбюро МОПР з'явіўся адзін васковы настаўнік, які прынёс у фонд МОПР афіраваныя ім і яго аднавяскоўцамі 550 рублёў. З хваляваннем гаварылі гэты актывіст аб велізарнай матэрыяльнай і маральнай дапамозе МОПР, якую адчувалі палітзняволеныя ў былой панскай Польшчы. У прыватнасці, яго сястра была літаральна выратавана МОПРам з кіпцюроў смерці.

За 11 месяцаў свайго існавання МОПР'аўская арганізацыя па нашай вобласці прарабіла значную арганізацыйную і выхаваўчую работу. У сотнях вёсак, па ініцыятыве самых сялян, часта без належнага кіраўніцтва і дапамогі з боку раённых арганізацый, створаны первічныя арганізацыі МОПР, якія ўцягваюць сялян у актыўнае жыццё, будзяць іх сазнанне і ініцыятыву ў вялікай творчай рабоце па сацыялістычнай перабудове жыцця.

Выдатных поспехаў дабіліся Ружанская раённая арганізацыя (старшыня райкома МОПР тав. Шапавалаў), якая налічвае ў сваіх радах больш 4 тысяч членаў. У гэтым раёне створана 88 ячэек, з іх 70 на вёсцы. Сабрана ў інтэрнацыянальны фонд больш 17 тысяч рублёў. МОПР'аўцамі створана 18 брыгад, якія працуюць на лесазвазках, члены арганізацыі прымаюць асабліва актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі.

За час справаздачна-выбарчай кампаніі некалькі ажывілася работа ў Малярыцкім, Жабінкаўскім і Кобрынскім раёнах.

Ініцыятарамі і застрэльшчыкамі ў арганізацыі МОПР'аўскай работы з'яўляюцца мясцовыя актывісты, вельмі многія з якіх самі прайшлі праз пекла фашысцкіх засценкаў у панскай Польшчы. У калгасе імені Варашылава, Кобрынскага раёна, арганізатарам і кіраўніком ячэйкі МОПР з'яўляецца калгаснік Глёк Грыгорый, які прасядзеў 7 год у польскіх турмах, перанёс нечалавечыя здзекі і катаванні.

Але трэба сказаць, што многія нашыя партыйныя арганізацыі да гэтага часу вельмі мала зрабілі для шырокага разгортвання МОПР'аўскай работы, [illegible] у назначэнай ступені скарысталі велізарныя магчымасці, якія ёсць у іх руках для арганізацыі і выхавання мас працоўных праз гэтае добраахвотнае таварыства. У Кляшчэльскім раёне нават не афармлена раённая арганізацыя, і гэты раён зусім не прадстаўлен на канферэнцыі. Вельмі слаба разгорнута МОПР'аўская работа ў Пораззўскім, Шэрашэўскім і радзе іншых раёнаў. У горадзе Брэсце побач з добрымі прыкладамі работы асобных арганізацый (міжрайгандаль, рэмбаза, хлебакамбінат і інш.) у радзе прадпрыемстваў і ўстаноў, у прыватнасці на чыгуначным вузле, первічныя арганізацыі МОПР альбо зусім не створаны, альбо не праяўляюць прызнакаў жыцця. Многія арганізацыі абмяжоўваюць сваю работу збіраннем членскіх узносаў і не вядуць у масах выхаваўчай работы. Зусім слаба наладжана МОПР'аўская работа ў школах. А якія велізарныя магчымасці ў руках камсамольскіх арганізацый і настаўніцтва прадастаўляе арганізацыя юных МОПР'аўцаў у школе для інтэрнацыянальнага выхавання нашай дзетвары!

Для МОПР'аўскіх арганізацый нашай вобласці вельмі актуальная з'яўляецца задача барацьбы за ўмацаванне дружбы народаў, за выкараненне нацыянальнай розні і адасобленасці, якія на працягу дзесяцігоддзяў культывіраваліся пануючым класам панскай Польшчы і іх вернымі лакеямі — контррэвалюцыйнымі шавіністычнымі партыямі ўсіх мастей і адценняў. Неабходна помніць указанне таварыша Сталіна (на XVII з'ездзе ВКП(б)) аб тым, што „перажыткі капіталізма ў сазнанні людзей значна больш жывучы ў галіне нацыянальнага пытання, чым у любой іншай галіне. Яны больш жывучы, бо маюць магчымасць добра маскіравацца ў нацыянальным касцюме".

Адкрываючаяся сёння абласная канферэнцыя, якая будзе падводзіць вынікі сваёй 11-месячнай работы і падагульваць лепшы вопыт перадавых арганізацый, павінна па-большэвіцку ўскрыць усе недахопы ў рабоце і намеціць практычныя шляхі для стварэння моцных МОПР'аўскіх арганізацый у гарадах і вёсках нашай вобласці.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам і пры штодзённай дапамозе партыйнай арганізацыі, абласная арганізацыя МОПР павінна стаць і стане баявой масавай арганізацыяй, здольнай справіцца з велізарнымі задачамі, якія перад ёю стаяць.

Яшчэ раз аб спісах выбаршчыкаў

Рэчыцкі сельскі совет (Брэсцкі раён) і яго старшыня тав. Раманюк не надаў належнай увагі важнейшай справе — складанню спісаў выбаршчыкаў. Яны хоць і былі вывешаны своечасова, але зроблена гэта так, што маса выбаршчыкаў не мае магчымасці праверыць сябе ў спісах і заявіць аб недакладнасцях і скажэннях.

Спісы вісяць у хаце-чытальні, якая днём звычайна закрыта, а вечарамі застаецца без асвятлення. Прычым, калі спісаў няма дзяжурнага, які мог-бы даваць указанні.

Між тым, спісы складзены вельмі неахайна. На 26 чалавек у спісах не ўказана імя па бацьку, у многіх напісана толькі прозвішча. Выбаршчыкі Вядмілер Юльян і Марыя занесены ў спіс без указання года нараджэння. Адсутнічаюць такія даныя і аб многіх іншых выбаршчыках.

Гэтыя скажэнні і недахопы неабходна зараз-жа выправіць, прыцягнуўшы для дасканалай праверкі спісаў надзейных таварышоў з мясцовага актыва, членаў акруговых выбарчых камісій, агітатараў.

Цэнтр выбарчага ўчастка знаходзіцца ў хаце-чытальні. Але пакуль што аб гэтым цяжка здагадацца. Няма лозунгаў, плакатаў, не арганізаван стол даведак.

Далёка не ўсё яшчэ зроблена па гэтаму [illegible] сельсовету і для ахопу агітацыйнай работай усіх выбаршчыкаў. У [illegible]0 акрузе, якая [illegible] 18 [illegible]

Усе [illegible]

на неа[illegible]

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

СЛОВЫ І РЭЧАІСНАСЦЬ

Калі верыць словам старшыні Гайнаўскага горвыканкома тав. Лапіцкага, то падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы у горадзе праходзіць без „сучка і задорынкі". Усе выбарчыя камісіі працуюць. Участкі маюць добраабталяваныя памяшканні. Вывешаны акурагна-напісаныя спісы, арганізавана праходзіць іх праверка, на ўчастках наладжана агітацыйна-масавая работа.

Аднак гэты спакой і ўпэўненасць нічым не абгрунтаваны і яны выкліканы наведаннем сапраўднага становішча ходу выбарчай кампаніі ў горадзе.

Пры бліжэйшым знаёмстве пераконваешся, што запраўднасць далёка ад красамоўных слоў і настрояў старшыні горвыканкома.

Сляды спешкі, неарганізаванасці бачны за ўсім. Да падбору памяшканняў пад акруговыя і ўчастковыя камісіі ў горвыканкоме адносіліся безадказна. Памяшканні многіх камісій непрыгодны для гэтай вялікай справы. Ні на адным з памяшканняў участковых камісій няма шыльдаў. Яшчэ не прыступілі да абсталявання.

Кіраўскі выбарчы ўчастак размешчан у карыдоры будынка народнага суда. Памяшканне не апісляецца. Няма вакон. Ту[illegible] брудна, сыра, няма сталоў і крэслаў. Члены ўчастковай камісіі не дзяжурыць.

Яшчэ горш справа на выбарчым участку № 3, які размешчан у клубе завода імені Варашылава. Спецыяльнага памяшкання участковая камісія не мае. Спісы вывешаны ў фае. Да 7 гадзін вечара клуб закрыт, а вечарам дэманстрыруюцца кінафільмы. Такім чынам, калі выбаршчык хоча праверыць сябе ў спісах, ён абавязкова павінен купіць білет у кіно. Гэта недарэчна!

Для ўчастковай выбарчай камісіі № 2 адведзен невялікі пакой у школе ФЗА. Тут дзяжурстваў не наладжаны. Спісы вывешаны ў пакоі, які ўвесь час закрыт.

Безадказна адносіліся ў горвыканкоме да складання спісаў выбаршчыкаў. Спісы напісаны неахайна, з памаркамі, рознымі чарнідамі. Цікава адзначыць такі факт: у горвыканкоме ведалі аб безадказных адносінах да складання спісаў і на ўсякі „выпадак" на кожным участку вывезлі запасны бланк..

На выбарчых участках № 7 і 6 агітатары правялі кантрольную праверку правільнасці складання спісаў. І тут выяўлена, што на 7 выбарчым участку з 179 выбаршчыкаў у 40 направільна занесены прозвішчы, маюцца 64 прозвішчы. На 6 выбарчым участку з 200 праверэных выбаршчыкаў знойдзена 40 пропускаў. Ёсць і такія выпадкі, калі аднаго выбаршчыка заносяць па двух акругах, перабыганы нумары выбарчых [illegible]руг па выбарах у гарадскі[illegible] г.

Ф. Ш[illegible]

ВУЧНІ АГІТАТАРЫ

— Першы раз у жыцці прыходзіцца мне выконваць пачесную работу агітатара. Я рада таму, што выконваю вялікую і адказную задачу, прыношу карысць грамадзтву. Выбаршчыкі аказваюць нам, агітатарам, цёплы прыём, запрашаюць у кватэру, каб гутарыць з намі, цікавяцца нашай вучобай і жыццём. Зацікаўленасць з боку выбаршчыкаў прымушае нас з яшчэ большай энергіяй працаваць, — піша ў школьную насценгазету вучаніца 10 класа 12 СШ Беравоўская.

Так, вучні гэтай школы актыўна ўключыліся ў работу на выбарчых участках. Агітацыйная работа для вучняў прыносіць вялікую карысць, бо яны адчулі адказнасць за даручаную справу.

Комсамольская арганізацыя сумесна з вучкомам 12 школы выдзеліла з пачатку выбарчай кампаніі для работы на ўчастках 15 агітатараў-вучняў, сярод якіх вызначаюцца Мальніцкая, Хайкерн, Фішбейн, Цукерман, Дэмб. Яны працуюць у 7 гуртках 47 і 49 выбарчых округ па выбарах у гарадскі Совет. Кожны з гэтых агітатараў правёў ўжо па дзве заняткі аб Сталінскай Канстытуцыі і Палажэнні аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія і сельскія Советы дэпутатаў працоўных.

На занятках у гэтых вучняў вялікая актыўнасць. Выбаршчыкі задаюць розныя пытанні. Агітатара Цукермана папрасілі, каб ён растлумачыў аб паходах Антанты на Совецкую краіну ў часе грамадзянскай вайны. З вялікім захапленнем расказаў агітатар аб доблесным Чырвонай Арміі, якая пад кіраўніцтвам таварышоў Сталіна, Фрунзе, Варашылава, Будзённага адбіла ўсе атакі і прошукі ворагаў.

Разнастайныя пытанні задаюць выбаршчыкі, і таму агітатар павінен многа працаваць над сабой, многа рыхтавацца п е р а д заняткамі.

Вучні - агітатары праводзяць сваю работу на роднай мове — польскай, яўрэйскай і рускай, у залежнасці ад патрабаванняў выбаршчыкаў.

Да кашгоўнага пачыну агітатараў 12 школы патрэбна адносіці індывідуальную работу з выбаршчыкамі.

Грамадзянка Шулкіна Варвара, якая пражывае па вул. 17 верасня ў доме № 47, па сваёй хваробе не можа наведваць заняткі. Вучні-агітатары Тэнэнбаум і Дэмб наведалі яе на кватэры, дзе растлумачылі выбарчы закон. Вылыцу Лейбе 80 год. Яму цяжка прыйсці да месца збору. Вучань Фішбейн расказвае яму аб новым выбарчым законе. Вучнямі арганізоўваецца праверка спісаў выбаршчыкаў.

Па прыкладу 12 школы, 15 агітатараў-вучняў з 15 СШ таксама праводзяць агітацыйную работу.

Вучні старэйшых класаў школ горада і раёна могуць аказаць вялікую дапамогу партыйным і совецкім арганізацыям у паспяховым правядзенні выбарчай кампаніі. Патрэбна толькі, каб гэтымі маладымі агітатарамі добра кіравалі, цікавіліся іх работай.

Н. А. Рабоўскі.

У Матыкалах дрэнна рыхтуюцца да выбараў

Да дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных засталося нямнога часу. Кожны дзень цяпер вырашае поспех агітацыі за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Гэтага зусім не ўлічваюць у Матыкальскім сельсавеце, дзе работа па растлумачэнню Канстытуцыі і выбарчага закона, а таксама па азнаямленню і агітацыі за зарэгістрыраваных кандыдатаў у абласны, раённы і сельскія советы пастаўлена яўна нездавальняюча.

Па Матыкальскаму сельсавету налічваецца 23 агітатары, але 10 з іх яшчэ за работу не ўзяліся. Ды і таварышы, якія працуюць, не атрымліваюць ніякага кіраўніцтва і дапамогі, і таму якасць работы раду агітатараў нізкая. Кіраўнікі агітколектыва т. т. Жукоўскі і Дэмідзенка не правялі ні аднаго семінара. Некаторыя агітатары самі дрэнна разбіраюцца ў выбарчым законе. Агітатары т.т. Ермаловіч і Ніканюк яшчэ самі не ведаюць сваіх кандыдатаў.

Варта адзначыць, што вельмі слаба прыцягнута да работы масцовая інтэлігенцыя. Толькі ў двух напоўных сярэдніх школах ёсць 15 настаўнікаў. Але працуюць агітатарамі толькі двое.

Ні ў адной школе і хаце-чытальні няма выбарчых лозунгаў, плакатаў.

Па ўсіх трох выбарчых участках сельсавета спісы выбаршчыкаў вывешаны своечасова, але ў іх дапушчаны вялікі многія скажэнні і памылкі, якія сельсаветам марудна выпраўляюцца.

У спісах па Ц-рэбуньскаму ўчастку прапушчана некалькі дзесяткаў выбаршчыкаў. Прозвішча настаўніцы Шэронавай перабэтана. Па Матыкальскаму участку ў радзе выпадкаў у спісах не ўказаны імёны па бацьку, год нараджэння выбаршчыкаў.

Брэсцкаму райкому партыі неабходна неадкладна заняцца наладжаннем агітацыйнай і арганізацыйна-тэхнічнай падрыхтоўкі да выбараў у пагранічным Матыкальскім сельсавеце. М. Гуравіч.

Цяга да вучобы

З вялікім [illegible] праходзіць у Омску пр[illegible] ладокой і калгасо[illegible]оленыя вучылі[illegible]

Закс

Антопаль. Раёна[illegible] прызыву моладзі ў [illegible] цярпен[illegible] вучобу. і чыгуначныя вучыл[illegible]ожна ба[illegible]лы фабрычна-заводскае[illegible]е. Яны пры[illegible] закончыла разгляд з[illegible]калі будуць [illegible]піўшых ад моладзі ра[illegible] [illegible]ліцеры на пра[illegible]дыя патрыеты вызвалеў[illegible]ча просяць камісію [illegible] іх, калі будуць горача адгукнуліся на [illegible]емствы партыі і ўрада [illegible]ацца паведамленні аб дні [illegible]рэнні дзяржаўных пра[illegible]ўкі ў школы і вучылішчы. [illegible]рэрваў. У райвыканком[illegible] многімі юнакамі ў райвыкан[illegible]падана каля ста заяў на[illegible]ком прыходзяць бацькі. Яны ад[illegible]стаўленыя 50 месц.

Камісія зрабіла дасканалы[illegible]шчырага серца выказваюць сваю [illegible]бор. Права атрымаць пуц[illegible]радасць і задавальненне тым, што вучобу прадастаўлена [illegible]іх дзеці атрымалі ад совецкай [illegible]юнакам. З 50 чалавек, прызваных [illegible]улады магчымасць вучыцца. у гайнаўскую школу ФЗА і [illegible]Бацькі шчыра дзякуюць партыі брэсцкія рамесленыя вучылішчы, і совецкаму ўраду за прадастаўленае права працоўнай моладзі 13 юнакоў з гарадскога пасёлка выбраць сабе прафесію і стаць Антопаля, а астатнія з вёсак высокакваліфікаванымі рабочымі. раёна.

М. Шур.

На вучобу адабрана 164 вучні

Пружаны. Для вучобы ў рамесленыя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння раённая прызыўная камісія адабрала 134 вучні, 57 вучняў накіраваны на вучобу ў рамесленыя вучылішчы гор. Брэста і 77 чалавек у Гайнаўскую школу ФЗА.

Усяго на імя прызыўной камісіі ад моладзі раёна паступіла звыш 400 заяў.

* * *

Камянец. Днямі закончыла работу раённая камісія па прызыву моладзі ў рамесленыя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння.

За тры дні разглядзена 160 заяў. Адабрана для пасылкі на вучобу 30 чалавек. 7 чалавек з раёна атрымалі пуцёўкі на вучобу ў рамесленыя вучылішчы г. Брэста і 23 чалавекі — у Гайнаўскую школу ФЗА.

Каштоўны пачын

З вялікай радасцю комсамольцы і несаюзная моладзь галоўных вагонных майстэрань Брэсцкага чыгуначнага вузла суустрэлі урадавае паведамленне аб адкрыцці ў горадзе Брэсце рамесленых вучылішчаў. 10 лістапада комсамольская арганізацыя, абгаварыўшы гэтае пытанне, узяла на сябе практычныя абавязацельствы па дапамозе неабходнымі інструментамі ўноў адкрываючымся вучылішчам. Комсамолец Царык І. абавязаўся зрабіць малаток, кронцыркуль і нутрамер. Комсамолец тав. Крышнёў абавязаўся зрабіць малаток, зубіла і іншыя інструменты. Узялі абавязацельствы і другія комсамольцы.

13 лістапада пасля работы ў цэху засталіся комсамольцы тт. Солтан, Руды, Ошчарэк, Драніца, Наумаў, Разумовіч, Мішеў, Гермоўскі, яны зрабілі разцы токарныя, верна, зубіла, адвёрткі і інш. Удзельнічалі ў рабоце па падрыхтоўцы інструментаў і маладыя рабочыя з несаюзнай моладзі тт. Віктарава і Горчук. Яны заявілі: „Мы будзем разам з комсамольцамі работаць і гатовіць падарункі для ўноў адкрываючыхся вучылішчаў".

Жыва адгукнуліся на пачын комсамольскай арганізацыі і маладыя рабочыя кузнечнага цэха. Вучань токара, 15-гадовы Патанін Эугені, сказаў: „Я паступаю ў рамесленае вучылішча, для мяне гэта вялікая радасць. Падрыхтую для сябе неабходны інструмент". Слова сваё ён выконвае, рыхтуе малаток і інш. неабходныя рэчы.

Пачын нашай комсамольскай арганізацыі павінны падтрымаць усе комсамольскія арганізацыі вобласці.

П. І. Пракапенка,
сакратар комсамольскай арганізацыі галоўных вагонных майстэрняў Брэст-Палескі.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты сельскіх Советаў

У Расянскім сельс[illegible]веце, Высокаўскага раёна, з вя[illegible]мам прайшлі сходы [illegible]каў па вылучэнню ка[illegible] дэпутаты сельскага С[illegible] 28 акруговых выбарч[illegible] па выбарах у сельскі [illegible] закончылі рэгістрацы[illegible]таў, вылучаных на сх[illegible]

Сярод зарэгістрыра[illegible] Лаўрэнцьевіч Кучук [illegible] актывіст, які п нмае с[illegible]ны ўдзел у рабоце с[illegible]вета, Екацярына Ніка[illegible]хардзіна — настаўніца [illegible] школы, бядняцка Над[illegible]вестраўка Варомова [illegible] Расна.

Вылучаны кандыда[illegible]таты сельскага Совета [illegible]барчай акрузе селя[illegible] Міхайлавіч Кулішу[illegible] заяве аб згодзе ба[illegible]піша: „Дзякую выбар[illegible] аказанае мне давер'е. [illegible] што высокую чэсць [illegible] апраўдаю на практыч[illegible]

Па ўсіх выбарч[illegible] абраны даверанымі, а[illegible]пілі да агітацыі за с[illegible]датаў.

Кандыдаты сялян вёскі Белавічы

Памяшканне Белавіцкай школы. На сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты сельскага Совета, прыйшло звыш 250 чалавек. Першым выступіў селянін Іосіф Крыўда.

— Я, — гаворыць ён, — прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Белавіцкага сельсовета былую батрачку Елену Голуб. Усё сваё жыццё яна працавала на багатых. Совецкая ўлада зрабіла былую батрачку роўнапраўнай грамадзянкай нашай краіны. Елена Голуб з чэсцю апраўдае наша давер'е.

Сход аднагалосна вылучае Елену Голуб кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета. Усяго ад сваёй вёскі сяляне вылучылі 9 кандыдатаў у дэпутаты сельскага Совета. Сярод іх настаўнік Белавіцкай пачатковай школы Валах Я. І., сяляне Мажейка Уладзімір, Цвел Лазоўскі, Максімчык Ольга і іншыя.

Сходы па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты сельскіх Совета прайшлі ў вёсках Ізацевіцкага, Сеньківіцкага, Жытнецкага і іншых сельсоветаў Косаўскага раёна.

М. Павкоў.

258

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ

БОЛЬШ УВАГІ АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ ПЫТАННЯМ

Сакратар Бярозаўскага райкома партыі т. Снегаў паведаміў мне, што на станцыі Бяроза арганізавана первічная партыйная арганізацыя, раней там была кандыдацкая група, і назваў сакратара первічнай партарганізацыі тав. Лучыніна. На пасяджэнні райкома партыі гэта арганізацыя зацверджана 26 кастрычніка. З гэтымі данымі я прыбыў у первічную арганізацыю.

Тав. Лучынін, азнаёміўшыся са мной, расказаў аб рабоце первічнай партарганізацыі, паказаў план работы.—У нашай партарганізацыі ёсць тры члены ВКП(б) і чатыры кандыдаты партыі,—гаворыць тав. Лучынін, — комуністы дружна ўзяліся за работу, наладжваем справу вучобы комуністаў. Член партыі тав. Валісевіч і кандыдат партыі тав. Арсеньеў вывучаюць чацверты раздзел „Кароткага курса гісторыі ВКП(б)", тры кандыдаты т.т. Егораў, Басісты, Сокалаў не працуюць над павышэннем свайго тэаретычнага ўзроўню, і аб гэтых таварышах пытанне будзе разглядацца на чарговым партыйным сходзе. Членскія ўзносы комуністамі ўплочаны ўключна па кастрычнік месяц.

Пры праглядзе партыйнай гаспадаркі, высветліўся рад істотных недахопаў. Пратаколы вельмі слаба афармляюцца. Амаль кожны пратакол не падпісан ні сакратаром, ні старшынёй партыйнага схода. Асабліва гэтыя недахопы адносяцца да часу, калі была кандыдацкая група. Нават першы пратакол арганізацыйнага схода кандыдацкай групы ад 10 ліпеня 1940 года падпісан толькі сакратаром партсхода, а для старшыні схода нават не астаўлена месца. Нажаль, на гэтым-жа сходзе прысутнічаў нам. начальніка політаддзела Брэсцкага аддзялення чыгункі тав. Черныш.

Кніга ўчоту комуністаў аказалася незапоўненай. Сакратар партарганізацыі растлумачыў наяўнасць гэтага недахопу вельмі проста.—Я не магу запоўніць кнігу ўчоту, няма прымацавальных талонаў, ёсць толькі на мяне аднаго, — і тут-жа выняў з кішэні прымацавальны талон № 91, выпісаны райкомам КП(б)Б 24 кастрычніка. — У райкоме, — гаворыць. т. Лучынін, — ёсць асабовыя справы толькі на двух кандыдатаў партыі, але яны яшчэ не ўзяліся на ўчот.

Выходзіць, што з 10 ліпеня існавала кандыдацкая група, афармленая з грубым парушэннем інструкцыі ЦК ВКП(б), а зараз з 25 верасня арганізавана і працуе первічная партыйная арганізацыя, якую 26 кастрычніка, як гаворыць сакратар партарганізацыі т. Лучынін, райком зацвердзіў.

Чаму так здарылася, што райком партыі замест выпраўлення першай памылкі дапусціў і другі раз парушэнне інструкцыі ЦК ВКП(б)? Акрамя таго ад комуністаў не ўзятых на ўчот спагнаюцца членскія ўзносы, што таксама яўна супярэчыць указанням ЦК ВКП(б).

Сакратар РК КП(б)Б т. Снегаў і загадчык оргінструктарскім аддзелам т. Жыгулька нават не пацікавіліся, хто з комуністаў узяты на ўчот, а растлумачылі проста: ёсць тры члены ВКП(б), значыць трэба арганізаваць первічную партарганізацыю.

Гэты факт сведчыць, што арганізацыйна-інструктарскі аддзел райкома партыі не сур'ёзна займаецца сваёй непасрэднай справай. Райком КП(б)Б і яго сакратары ў сваю чаргу не ўдзяляюць адпаведнай увагі арганізацыйным пытанням і тым самым дапускаюць грубыя памылкі.

А. Рожанец.

Пры Доме партыйнай асветы Мінскага гаркома КП(б)Б з 18 лістапада пачаліся заняткі марксісцка-ленінскага ўніверсітэта для работнікаў літаратуры і мастацтва БССР.
На здымку: на лекцыі аб міжнародным становішчы.

Фота І. Шышка. *Фотахроніка Белта.*

Работа партбюро прызнана здавальняючай

На справаздачным сходзе первічнай партарганізацыі Н-скай часці, які адбыўся 16 лістапада, сакратар партыйнага бюро падрабязна расказаў аб тым, як партбюро і ўся партыйная арганізацыя змагаліся за авангардную ролю комуністаў, мабілізоўвалі партыйных і непартыйных больш[illegible]вікоў на барацьбу за павышэн[illegible] баявой гатоўнасці падраздзялен[illegible]

— Справаздачны перыяд бы[illegible] вялікімі падзеямі ў жыцці [illegible] раздзялення, — гаворыць [illegible] Мацюк. — Выконваючы спецы[illegible]нае ўрадавае заданне, кому[illegible] нашай партыйнай арганізацыі па[illegible]казалі, што яны ўсёю душой ад[illegible]даны партыі Леніна-Сталіна, [illegible] ўраду. Т.т. Закроў[illegible], Мурыч, Бобрыкаў і [illegible] ўзнагароджаны [illegible]

[illegible] намеціць шляхі выпраўлення маючыхся недахопаў.

У сваім выступленні тав. Путулін указваў, — што работа з нізавымі агітатарамі ў падраздзяленні пастаўлена слаба, з імі мала праведзена нарад, у результаце яны часта не ведалі над чым не[illegible]ходна было працаваць. Гэты [illegible]едахоп новаму саставу бюро [illegible]рэба ў бліжэйшы час ліквідаваць [illegible]абіцца таго, каб цэнтральная [illegible]гурай у агітацыйна-растлумачальнай рабоце быў агітатар.

У жыцці падраздзялення вялікую ролю адыгрывае комсамольская арганізацыя, якая складае [illegible]льшую частку ўсяго асабовага [illegible]тава.

Выступаючы ў спрэчках тав. [illegible]окалаў застанавіўся на пытанні [illegible]дапамогі, якую аказвала партарганізацыя комсамолу. Ён указаў, [illegible] нізавыя арганізацыі недастат[illegible]на дапамагалі прэзідыумам [illegible]выкладам [illegible] служыць былы [illegible]торг [illegible] Багамолаў, які ў план работы ўносіў добрыя мерапрыемствы, але іх не выконваў. Альбо ўзяць комуніста тав. Васільева, ён мала цікавіўся работай комсамола, у результаце былі сарваны два комсамольскіх сходы, а партыйнае бюро ніякіх мер да гэтых таварышоў не прымала.

Выступаўшыя т.т. Мілюцін, Рудакоў, Петушкоў і другія, раскрываючы недахопы, далі рад канкрэтных прапаноў па паляпшэнню ўсёй партыйна-выхаваўчай работы.

Сход прайшоў на высокім ідэйным узроўні. Комуністы, выявіўшы недахопы, намецілі канкрэтную праграму далейшай работы партарганізацыі.

Асульны партыйны сход работу бюро прызнаў здавальняючай. У новы састаў партыйнага бюро выбраны т.т. Закроўскі, Мацюк, Мілюцін, Каўтун і Глушчанка.

Е. А. Рахман.

Сустрэча з кандыдатам

Цёмны асенні вечар. З-за пяжкіх дажджлівых хмар, якія павісілі над вёскай, украдкам час ад часу выглядае месяц. З Дабучынскіх хутароў, з вёсак Шыдлоўшчыне Ольчы і іншы[illegible] [illegible] свайго кандыдата. Калі тав. Шышкін скончыў свой расказ аб пройдзеным жыццёвым шляху [illegible]лова ўзяў селянін С[illegible] Г[illegible]

Чаш кандыдат

[illegible] іх закон школы льецца [illegible]о. Сёння тут намеча[illegible] выбаршчыкаў з кан[illegible] дэпутаты абласнога Совета. На сустрэчу сабралася [illegible] чалавек.

[illegible] прэзідыума схода [illegible] слова кандыдату ў [illegible]в. Шышкіну Аляксею [illegible] выбаршчыкі ўважліва [illegible] свайго кандыдата. Ён [illegible] залікіх справах со[illegible]а і нашай доблеснай [illegible]міі, якая стаіць на [illegible] працы працоўных [illegible] Саюза, аб творчай пра[illegible] народнага народа.

[illegible] у депутаты аблас[illegible]адрабязна расказвае [illegible]ваю аўтабіяграфію. [illegible]а ловяць кожнае [illegible]цы. Яны жадаюць [illegible] з жыцця [illegible]

[illegible]овага са[illegible]лнога гу[illegible]таніяю, і трэба [illegible] комі[illegible] ішлі [illegible]радах барацьбітоў [illegible] загада наркома.

[illegible]ыклад, т.т. Зотаў, Белакудра і другія [illegible]ыклад сваім падпа[illegible]ва ўчобе і дысцып[illegible]муніст тав. Осаулка [illegible] лепшым агітатарам па [illegible]ченні загадаў наркома.

[illegible] поспехі ў рабоце партый[illegible]нізацыі вялікія, адзак ужо [illegible] выступленні комуністаў [illegible] што партыйны сход [illegible]рытымліваецца традыцый[illegible]ікоў — не заспакайваецца [illegible]дасягнутым. Комуністы са[illegible]раліся на сход не толькі для таго, каб падвесці вынікі праробленай работы, абагуліць вопыт, але і для таго, каб калектыўна

Узняць якасць агітацыйнай работы

Комсамольская арганізацыя г. Брэста актыўна працуе па выбарах у мясцовыя Советы депутатаў працоўных. Да агітацыйнай работы прыцягнута звыш 400 комсамольцаў. У выбарчых камісіях работае 312 чалавек моладзі, з гэтай колькасці 189 комсамольцаў.

Таварышы Гайда (водаччы завод), Обучарэк (вагонны майстэрні), Шчэрба (паравозны дэпо), Фесько (сакратар комсамольскага камітэта чыгуначнага тэхнікума) вылучаны кандыдатамі ў гарадскі Совет депутатаў працоўных.

Многія комсамольцы нашай арганізацыі прымаюць актыўны ўдзел у правядзенні агітацыйна-масавай работы сярод працоўных. Сакратар комсамольскай арганізацыі аблопажыўсаюза тав. Прошын кіруе агітколектывам, у саставе якога выключна моладзь. Агітатары яго сістэматычна два разы ў тыдзень праводзяць заняткі з выбаршчыкамі, амаль усе яны закончылі вывучэнне Палажэння аб выбарах і правялі гутаркі па дакладу таварыша Калініна на партыйным актыве г. Масквы аб комуністычным выхаванні. У час кожнай гутаркі робіцца агляд міжнародных падзей па газетных матэрыялах.

Добра будуюць свае гутаркі комсамольцы-агітатары тт. Вершак (сакратар комсамольскага камітэта Брэст-Цэнтральны), Маркаў (аблопажыўсаюз). Іх расказы змястоўны і цікавы. Гутаркі гэтых агітатараў з вялікім задавальненнем слухаюць выбаршчыкі. Малады агітатар тав. Кулай (вагонны майстэрні) правёў 9 гутарак з выбаршчыкамі. Ён выразна расказвае на занятках аб росце добрабыту працоўных у заходніх абласцях за перыяд улады Совецкай. Гэтыя гутаркі ён увязвае з мінулым цяжкім жыццём працоўнага народа. Выбаршчыкі за яго работу шчыра палюбілі. Комсамольская арганізацыя прыняла тав. Кулай у свае рады.

Вялікую работу правяла комсамольская арганізацыя горвыканкома. Яна дапамагала складаць спісы выбаршчыкаў. Асабліва праявілі сябе на гэтай рабоце тт. Шырнюк, Новікава, Камкова і несавязная моладзь тт. Райзільберг, Грынбург і інш. Гэты адказны ўчастак работы ўзначальвала сакратар комсамольскай арганізацыі тав. Кац.

Актыўна ўключыліся ў выбарчую кампанію і комсамольскія арганізацыі школ горада. Яны аказваюць дапамогу ў афармленні выбарчых участкаў і ў абслугоўванні выбаршчыкаў мастацкай самадзейнасцю. Пионеры школы № 12 арганізавалі калектыў юных пропагандыстаў. Яны распаўсюдзілі сярод выбаршчыкаў 750 экземпляраў выбарчай літаратуры.

Комсамольская арганізацыя школы № 7 стварыла агіткалектыў. Комсамольцы-агітатары праводзяць сярод працоўных гутаркі на польскай мове. Тры агітатары прынятыя первічнай арганізацыяй у комсамол.

Комсамольская арганізацыя чыгуначнага тэхнікума вылучыла агітатара на кожны дом выбарчага ўчастка. Распрацаваны практычныя мерапрыемствы па абслугоўванню працоўных мастацкай самадзейнасцю.

